# НАСТАЎНІК І САЛДАТ

Пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны некаторыя салдаты, што прайшлі праз цяжкія выпрабаванні, вярнуліся да настаўніцкай працы. Сярод іх быў і ўдзельнік вайны Мікалай Пампеевіч Каратай.

Наш зямляк нарадзіўся ў 1915 годзе на Навагрудчыне ў вёсцы Нянькава. Перад вайной паспеў закончыць сямігодку ў Любчы, гімназію ў Навагрудку, педагагічны ліцэй у Вільні. У 1940 годзе паступіў у Беластоцкі інстытут замежных моў, але правучыўся там толькі год, бо пачалася вайна. Будучы настаўнік быў прызваны ў Чырвоную Армію пасля вызвалення Навагрудчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у ліпені 1944 года. Ваяваў на 2-ім Прыбалтыйскім і 1-ым Беларускім франтах. Чырвонаармеец 525-га стралковага пяхотнага палка 171-й стралковай дывізіі быў узнагароджаны медалямі “За адвагу”, “За вызваленне Варшавы”, “За ўзяцце Берліна”, “За перамогу над Германіяй”. Медаль “За адвагу” чырвонаармеец Мікалай Каратай атрымаў 20 сакавіка 1945 года. У час вайны такую ўзнагароду ўручалі байцам за асабісты подзвіг.



**Настаўнік Мікалай Каратай. 1950-я гг.**

Няпростым быў шлях да перамогі. Грамата, якая захавалася ў сямейным архіве настаўніка, сведчыць пра тое, што чырвонаармеец Мікалай Каратай загадам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага ад 6 сакавіка 1945 года атрымаў падзяку “за участие в боях по овладению городами Бельгард, Трептов, Грайфенберг, Каммин, Гюльцов, Плате – важными узлами коммуникаций и сильными опорными пунктами обороны немцев в Западной Померании”. Наш зямляк браў удзел у штурме Берліна, а медаль “За ўзяцце Берліна” атрымаў ужо ў званні сержанта. Як і многія іншыя франтавікі, ён не любіў расказваць пра вайну, не пакінуў успамінаў, але пра тое, праз што яму, радавому салдату, давялося прайсці, калі разам з баявымі таварышамі вызваляў Еўропу ад фашызму і дабіваў ворага ў яго логаве, мы можам даведацца з дакументальных кніг, якіх напісана нямала. І з гэтымі кнігамі трэба знаёміць у першую чаргу школьнікаў.

Пасля вайны ў 1948 годзе Мікалай Пампеевіч скончыў Мінскі педагагічны інстытут замежных моў і 8 гадоў выкладаў нямецкую мову ў Цырынскай СШ Карэліцкага раёна, а з 1956 года – у Карэліцкай сярэдняй школе, дзе паспяхова працаваў да пачатку 1970-х гадоў, дамагаючыся ў вучняў добрых ведаў. Яго дачка Святлана таксама атрымала педагагічную адукацыю і стала таленавітым навукоўцам, аўтарам падручнікаў для дзяцей.

**Святлана КОШУР**
Карэлічы

*Публікуюцца фота з архіва аўтара*



Красноармейц Коратай
Николай Помпеевич

Приказом Верховного Главнокомандующего Маршала Советского Союза товарища Сталина от 2 мая 1945 г. № 359.
за взятие города Берлин.
всему личному составу нашего соединения, в том числе и Вам, принимавшему участие в боях, ОБ'ЯВЛЕНА БЛАГОДАРНОСТЬ.

КОМАНДИР ЧАСТИ [illegible]
(подпись)

МЫ В БИТВАХ РЕШАЕМ СУДЬБУ ПОКОЛЕНИЙ,
МЫ К СЛАВЕ ОТЧИЗНУ СВОЮ ПОВЕДЕМ!



# ГРАМОТА

Тов. Кр-цу Каратай Николаю Потаповичу

Приказом Верховного Главнокомандующего Маршала Советского Союза товарища Сталина от 6-го марта 1945 г., № 292, всему личному составу нашего соединения, в том числе Вам, принявшему участие в боях по овладению городами БЕЛЬГАРД, ТРЕПТОВ, ГРАЙФЕНБЕРГ, КАММИН, ГЮЛЬЦОВ, ПЛАТЕ — важными узлами коммуникаций и сильными опорными пунктами обороны немцев в Западной Померании, ОБЪЯВЛЕНА БЛАГОДАРНОСТЬ.

Командир части ____________



Каратай М. П.  з баявымі таварышамі (сярэдні рад, стаіць 4-ы злева). 1945 г.